ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982
30
ВЕРАСНЯ
ЧАЦВЕР
№ 26 (1364)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

ЮБІЛЕЮ РАДЗІМЫ — ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ

БЮРО ПАРТКОМА

на чарговым пасяджэнні дэталёва разгледзела і прааналізавала дзейнасць добраахвотнай народнай дружыны БДУ. У час абмеркавання быў адобраны станоўчы вопыт работы ДНД, адзначаны пэўныя недахопы ў дзейнасці дружын філалагічнага факультэта і факультэта журналістыкі.

Бюро парткома абавязала партбюро, дэканаты, камітэты камсамола факультэтаў і штаб ДНД у бліжэйшы час ажыццявіць увесь комплекс арганізацыйных і палітыка-выхаваўчых мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне работы ДНД, павышэнне яе эфектыўнасці ў справе аховы грамадскага парадку.

У. ЯЦУХНА,
начальнік штаба ДНД.

КУРСЫ

павышэння кваліфікацыі для грамадзян замежных краін — выпускнікоў савецкіх ВНУ — упершыню пачалі дзейнічаць у Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна. У праграме курсаў — лекцыі па асноўных раздзелах сучаснай матэматыкі, прадугледжана таксама правядзенне семінараў і кансультацый вядучых вучоных. На курсы прыбылі выпускнікі універсітэта былых гадоў з Афганістана, Балгарыі, Германскай Дэмакратычнай рэспублікі, Кубы. Гэтая форма ўдасканалення атрыманых раней ведаў будзе спрыяць далейшаму росту навуковай і прафесійнай кваліфікацыі спецыялістаў, замацаванню інтэрнацыянальных сувязей.

Л. АЎСЯНКА,
дэкан па рабоце з замежнымі навучэнцамі, дацэнт.

ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

з 1 кастрычніка пачне заняткі на вячэрняй форме навучання. У трох групах будуць займацца рабочыя мінскіх прадпрыемстваў — аўтамабільнага, трактарнага заводаў, ВА «Інтэграл» і іншых. Сярод сённяшніх слухачоў — высокакваліфікаваныя рабочыя, ударнікі камуністычнай працы, прафсаюзныя, камсамольскія актывісты.

Хутка пачнецца прыём заяў ад паступаючых на дзённую форму навучання. Дэканаты факультэтаў, партыйныя, прафсаюзныя і камсамольскія арганізацыі правялі вялікую падрыхтоўчую работу. Наладжана інфармацыйна - даведачная служба. Выкладчыкі БДУ расказалі пра работу ПА ў воінскіх падраздзяленнях, на прадпрыемствах рэспублікі.

А. СЛУКА,
дэкан падрыхтоўчага аддзялення.

ПРАПАГАНДЫСТ — палітычны настаўнік, баец ідэалагічнага фронту. Ад яго прынцыповасці, ведаў і перакананняў у многім залежаць адносіны савецкага чалавека да працы і грамадскай дзейнасці, гэта ён дапамагае слухачам вызначыць сваё месца і ролю ў палітычным і эканамічным жыцці краіны.

На здымку: прапагандысты універсітэта дацэнт **А. І. Раковіч,** загадчык кабінета гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў **А. Ф. Алейнікава,** намеснік старшыні метадычнага савета, выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў **А. М. Гурко,** член парткома, загадчык сектара партыйнай адукацыі і лекцыйнай прапаганды парткома дацэнт **І. Ф. Раманоўскі,** член метадычнага савета, выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў **А. А. Скікевіч** абмяркоўваюць задачы на новы навучальны год у сістэме партыйнай адукацыі.

Фота В. ШАЧАКА.

ДЗЕНЬ ПРАПАГАНДЫСТА

СЛОВА ЖЫВОЕ І ШЧЫРАЕ

ПАЧАТАК новага навучальнага года ў сістэме партыйнай вучобы і эканамічнай адукацыі адзначаны ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна правядзеннем Дня прапагандыста.

Задачы, новыя формы работы прапагандыстаў на сучасным этапе былі акрэслены ва ўступным слове сакратара парткома М. Г. Елісеева, у дакладзе «Саюз непарушны рэспублік свабодных» выконваючага абавязкі загадчыка кафедры навуковага камунізму ІПК пры БДУ імя У. І. Леніна І. С. Сямыкіна. У цэнтры ўвагі былі і праблемы арганізацыі работы метадалагічнага семінара, на якіх спыніўся А. І. Ляўко — дацэнт, кіраўнік метадалагічнага семінара на біялагічным факультэце. Пра ўдасканаленне палітадукацыі ў святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС расказаў С. С. Шушкевіч — кіраўнік метадалагічнага семінара на фізічным факультэце, загадчык кафедры ядзернай фізікі, член бюро парткома. Вопытам работы па прапагандзе эканамічных ведаў падзяліўся А. А. Кузьмічоў — кіраўнік тэарэтычнага семінара «Эканамічная палітыка КПСС», дацэнт кафедры палітэканоміі гуманітарных факультэтаў.

Прапагандыст заўсёды быў і застанецца перадавым байцом ідэалагічнага фронту. Сучаснае жыццё ўзняло яго дзейнасць на якасна новы этап. Ад яго патрабуецца не толькі кампетэнтнасць і агульная эрудыцыя. Асаблівая ўвага звяртаецца зараз на яго ўменне наладзіць кантакт з аўдыторыяй, пры дапамозе ўмела падабраных фактаў, нечакана сфармуляваных пытанняў парушыць пасіўнасць, падвесці да актыўнага ўспрымання матэрыялу, разбудзіць пачуцці і думкі кожнага з тых, да каго ён звяртаецца са сваім словам.

У новым навучальным годзе ў сістэме партыйнай, камсамольскай і эканамічнай адукацыі БДУ, у якой працуюць зараз 47 метадалагічных, 23 тэарэтычных семінары, 17 школ навуковага камунізму, 4 школы марксізму-ленінізму, 5 палітшкол, будуць вывучацца актуальныя пытанні ўнутранай і знешняй палітыкі КПСС, міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, тэорыі марксізму-ленінізму, важныя праблемы навуковага пазнання і іншыя. У цэнтры работы семінараў і школ — вывучэнне матэрыялаў XXVI з'езда КПСС, рашэнняў Майскага (1982 г.) Пленума ЦК КПСС, работ таварыша Л. І. Брэжнева, дакументаў партыі і Савецкага ўрада.

Рэарганізацыя работы метадалагічных семінараў сістэмы партыйнай адукацыі Белдзяржуніверсітэта, якая адбылася ў 1981-82 навучальным годзе і была праведзена на аснове «Палажэння аб філасофскіх (метадалагічных) семінарах», распрацаванага АН СССР, значна актывізавала іх дзейнасць. Партыйныя арганізацыі факультэтаў і падраздзяленняў вялі і будуць весці работу па рэалізацыі пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым удасканаленні партыйнай вучобы ў святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС». Гэта дапаможа яшчэ больш палепшыць якасць партыйнай вучобы, яе тэарэтычны і метадычны ўзровень, узмацніць сувязь з жыццём.

І. РАМАНОЎСКІ,
член парткома універсітэта.

ХАРЧОВАЯ ПРАГРАМА: НА ШЛЯХАХ РЭАЛІЗАЦЫІ

ЯКАСЦЬ ВЫЗНАЧАЕЦЦА ІМГНЕННА

ПАЧЭСНЫ абавязак вучоных — імклівую навуковую думку ператварыць у канкрэтнае дзеянне. Своеасаблівым укладам вучоных у рэалізацыю Харчовай праграмы стане экспрэс-метад аналізу пасяўных якасцей насення збожжавых культур, які распрацоўваецца ў лабараторыі радыяцыйнай хіміі Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем.

На аснове суадносін паміж фізіка-хімічнымі характарыстыкамі якасці насення і іх усходжасцю з'явілася магчымасць вызначыць пасяўныя якасці без дапамогі традыцыйных спосабаў. На вызначэнне пасяўных якасцей збожжа кантрольна-насенным аграхімічным лабараторыям звычайна патрабуецца некалькі дзён. З дапамогай новага метаду той жа аб'ём работы будзе выкананы праз некалькі хвілін. Усё гэта можна зрабіць пры дапамозе простых ЭПР-спектрометраў, распрацаваных вучонымі-фізікамі універсітэта. Вялікія перспектывы выкарыстання экспрэс-метаду ў галіне селекцыі, спатрэбіцца ён і ў зернесховішчах:

А. МАКАРЧУК.

ПРАЦЯГВАЕЦЦА БІТВА ЗА ЎРАДЖАЙ 1982 ГОДА. УБРАЦЬ ВЫРАШЧАНАЕ ПРАЦАЎНІКАМІ ВЁСКІ ХУТКА І БЕЗ СТРАТ–БАЯВАЯ ЗАДАЧА КОЖНАГА ПАСЛАНЦА УНІВЕРСІТЭТА

АДРАСЫ ЎДАРНЫХ СПРАЎ

Звыш трох тысяч байцоў студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадаў Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна працуюць на уборцы ўраджаю 1982 года на тэрыторыі 5 раёнаў Магілёўскай вобласці ў 60 гаспадарках.

Круглянскі раён

Філалагічны факультэт — калгасы «Шлях да камунізму», «Свабода», саўгасы «Круча», «Авангард», «Някрасава».

Гістарычны факультэт — калгасы «Шлях Леніна», «Расвет», «Кастрычнік», саўгас «Цяцерына».

Шклоўскі раён

ФПМ — калгасы «Ударнік», «Дняпроўскі», «Маяк», «Праўда», «Радзіма», «Зара», імя Фрунзе, «Юбілейны», саўгасы «Гарадзішча», «Гарадзец», «Рабочы».

Геаграфічны факультэт — калгасы «Бальшавік», імя К. Маркса, імя Свярдлова, «Шлях да камунізму».

Быхаўскі раён

Фізічны факультэт — калгасы імя К. Лібкнехта, «Рэвалюцыя», «Расія», «Радзіма», «Перамога», саўгас «Вароніна».

Юрыдычны факультэт — калгасы імя Куйбышава, «Шлях да камунізму», імя Жданава, эксперыментальная база «Быхаўская», саўгас «Спадарожнік».

Чавускі раён

Біялагічны факультэт — калгасы «Юны камунар», імя Дзяржынскага, «Перадавік», «1 Мая».

Механіка-матэматычны факультэт — калгасы «Перамога», «Камуніст», «Ленінскі шлях», «Серп і молат», «Зара», «50 год БССР», «Пяцігодка», імя У. І. Леніна, «Свет Кастрычніка», саўгасы «Галавенчыцы», «Рэста».

Клімавіцкі раён

Хімічны факультэт — саўгасы «Высакоўскі», «Макеевічы», «Малышкавічы», эксперыментальная база «Раднянская».

Радыёфізічны факультэт — калгасы «Шлях да камунізму», «Чырвоны Сцяг», саўгас «Міласлявічы».

Факультэт журналістыкі — калгасы «Серп і молат», «Герой працы».

КАНТРАСТЫ АКТЫЎНАСЦІ

РЭЙД КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ»

Студэнты першых—чацвёртых курсаў БДУ імя У. І. Леніна прымаюць удзел ва ўборцы ўраджаю-82 у калгасах і саўгасах Магілёўшчыны. Юнакі і дзяўчаты здаюць экзамен восеньскаму полю не толькі на ўменне працаваць напружана, па-ўдарнаму, але і карысна жыць, адпачываць цікава і насычана. І ад таго, на які ўзровень пастаўлена ў студэнцкіх сельскагаспадарчых атрадах масава-палітычная, шэфская і пазааатрадная работа, залежыць канчатковы вынік працоўнага дэсанта.

КЛІМАВІЦКІ РАЁН

— Ды мы яшчэ толькі тры тыдні як прыехалі ў саўгас, — з бадзёрым аптымізмам адказалі студэнты хімічнага факультэта, што працуюць у саўгасе «Малышкавічы». — Але з заўтрашняга дня возьмемся за культурна-масавую работу. Ужо і план мерапрыемстваў распрацавалі, рэдкалегію газеты абралі, вось толькі фарбы ніхто да гэтага часу не даў, ды паперы няма...

Паперы, відаць, сапраўды бракавала, бо ў інтэрнаце, дзе жывуць студэнты, мы не ўбачылі ні баявога лістка, ні «маланкі», нават графік дзяжурства па пакоях адсутнічаў.

— Не хвалюйцеся, усё наладзіцца. Калектыў у нас добры. Хлопцы і дзяўчаты працуюць выдатна, штодзённа перавыконваюць план. А 17 верасня, у дзень ударнай працы, норма выпрацоўкі дасягнула 200 працэнтаў, — і камандзір атрада дацэнт Мікалай Рыгоравіч Рафальскі пачаў гартаць тоўсты сшытак, у якім акуратна быў падлічан увесь аб'ём работы атрада. — Вось на таку працавалі, вось больш 1000 снапоў льну звязалі, вось... А сёння хацелі правесці камсамольскі сход, даць назву атраду, ды вы якраз прыехалі.

Сапраўды, будучыя хімікі працуюць па-ўдарнаму, з агеньчыкам. Гэта пацвердзілі і дырэктар, і сакратар партыйнай арганізацыі саўгаса. Аднак добра працаваць — гэта яшчэ не значыць жыць цікава. Дапамогі ад студэнтаў чакаюць ветэраны вайны і працы, іх умелыя рукі патрэбны мясцовай школе. А які ж адпачынак без песні, без дасціпнага студэнцкага гумару? І вельмі шкада, што байцы «безыменнага» ССГА хімічнага факультэта некалькі аднабакова разумеюць ролю і магчымасці сельскагаспадарчага атрада. Між тым большасць з іх навічкамі на «бульбе» не назавеш: многія працуюць на уборцы ўраджаю другую, трэцюю, а то і чацвёртую восень. Вопыт ёсць, а вось прымяненне...

«Чалавек прыгожы працай. Іменна ў ёй праяўляюцца рысы сапраўднага гаспадара краіны.

Аднак не працай адзінай жыве кожны з нас. Таму на «бульбе» нельга ні на хвіліну забываць аб масава-палітычнай рабоце, аб шэфскай дапамозе мясцоваму насельніцтву, аб канцэртах, лекцыях, спартыўных спаборніцтвах — аб усім тым, з чаго складаецца шматграннае жыццё ССГА».

(З баявога лістка).

На наступны дзень мы наведалі вёску Хатовіж, цэнтр калгаса «Серп і Молат». Тут дыслацыруецца ССГА журфака...

Адчуваецца, што студэнты захоўваюць лепшыя традыцыі ССГА: добра працуюць, цікава адпачываюць. Не забываюць у атрадзе і аб шэфскай дапамозе. Вось вытрымка з баявога лістка (дарэчы, у атрадзе імя Івана Паўлючэнкава мы налічылі шэсць «маланак» і баявых лісткоў):

«З якім камсамольскім запалам узнімалі нашы дзяўчаты лён. Тут выявілася і адказнасць перад калгасам, і энтузіязм маладых. Вось яны — нашы перадавікі — Ніна Трубчык, Алена Пекар, Святлана Раманава, Ірына Новікава...

Удзячны нашым дзяўчатам і мясцовыя жыхары. Лілія Крышчань і Алена Чэчыкава з ахвотай дапамагаюць ветэранам вайны і працы ўбіраць бульбу».

Пазней мы даведаліся, што байцы атрада імя Івана Паўлючэнкава падрыхтавалі канцэрт для працаўнікоў калгаса, мітынг ля помніка народных мсціўцам і байцам Чырвонай Арміі, што загінулі, вызваляючы вёску ад ворагаў у час Вялікай Айчыннай вайны.

ШКЛОЎСКІ РАЁН

Мы в Малых Лозицах
Пока еще неделю,
Но подружиться
Все уже успели.
И дружба пригодится
Нам везде:
В учебе, отдыхе, труде...

Вось такі верш змясцілі ў сваёй газеце студэнты ССГА «Сузор'е». Калгас «Шлях да камунізму» стаў месцам дыслакацыі студэнтаў геаграфічнага факультэта. Таму і не дзіўна, што студэнты адчуваюць сябе тут нібы дома. Камісара атрада Уладзіміра Саўчанку мы адшукалі на спартыўнай пляцоўцы. Уся брыгада юнакоў (а гэта 17 чалавек) гуляла ў футбол.

— Як справы, хлопцы?

— Выдатна, — адказвае за ўсіх Уладзімір. — Усе працуюць добра. Аднак асабліва хочацца адзначыць нашых перадавікоў — Юрыя Кроха, Алега Катка, Марыну Собаль і Свету Казлову.

У дзённіку лінейнага сельскагаспадарчага атрада ёсць такія радкі:

«Трэці працоўны семестр працягваецца. Абавязак кожнага студэнта-камсамольца — своечасова ўбраць ураджай, унесці канкрэтны ўклад у выкананне Харчовай праграмы, прынятай на Майскім (1982 г.) Пленуме ЦК КПСС. Мы верым, што ты з гонарам выканаеш яго, унясеш пасільны ўклад у агульнанародную справу, разам з таварышамі па групе, курсу арганізуеш і будзеш весці лекцыйна-прапагандысцкую, культурна-масавую і шэфскую работу».

Гэтыя словы павінны стаць законам для кожнага камандзіра, камісара і байца сельскагаспадарчага атрада.

Члены рэйдавай брыгады: А. РУХЛЯ, сакратар камітэта камсамола, А. НЕЖАВЕЦ, намеснік сакратара камітэта камсамола па ідэалагічнай рабоце, А. ГУЛЕВІЧ, загадчык сектара ўліку, Л. ВАЎЧОК, сакратар камітэта камсамола супрацоўнікаў, А. ЛАЗОЎСКІ, карэспандэнт газеты «Беларускі універсітэт».

● РЭПАРТАЖ З ПАДШЭФНАЙ ГАСПАДАРКІ

ЭКЗАМЕНУЕ ПОЛЕ

Вырабіць у 1982 годзе 3900 тон бульбы, прадаць дзяржаве — 900 тон. Гэта абавязацельствы саўгаса «Гарадок», што ў Уздзенскім раёне. Выконваць іх дапамагаюць шэфы, якія працуюць на ўборцы бульбы. Сярод іх — і супрацоўнікі ўсіх факультэтаў, НДІ і астатніх структурных падраздзяленняў БДУ імя У. І. Леніна. Што зроблена, як замацоўваюцца шэфскія сувязі, якія цяжкасці існуюць. Пра гэта — вераснёўскі рэпартаж.

ДА ДЫРЭКТАРА саўгаса Сцяпана Аляксандравіча Шытыкі я трапіла якраз у той момант, калі ён падпісваў Ганаровыя граматы супрацоўнікам універсітэта, і неабходнасць майго першага пытання адпала сама сабой.

— Бачыце, добра вашы працуюць! Так і пішыце: усё добра.

— А ці сапраўды ўсё, Сцяпан Аляксандравіч?

З папярэдніх размоў я ведала, што жаданне шэфаў працаваць добра не заўсёды падмацоўваецца кіраўніцтвам саўгаса. Няма фронту работ. Гэтую скаргу мне давялося чуць не аднойчы. Увогуле працаваць было дзе, але як, напрыклад, растлумачыць такі факт: кіраўнікі заклікаюць людзей на ўборку бульбы ў нядзелю. Зразумела, калі патрэбна — значыць патрэбна. Зранку выходзіць народ на поле, а яно нават не разаранае. Такія недарэчныя дробязі запамінаюцца надоўга. Іменна з-за іх узнікае пытанне: «А ці патрэбны мы наогул?» Саўгас сцвярджае: патрэбны! А тыя, хто працуе, часам і сумняваюцца. Чаму так?

— Не паспяваем, да таго ж — аб'ектыўныя цяжкасці: дажджы ішлі.

— Якія дажджы? За ўвесь верасень ні кроплі не было.

— Ну, папаўся. Падвяла звычка... Шчыра кажучы, ні якія не аб'ектыўныя, самыя што ні на ёсць суб'ектыўныя: палі ў нас вельмі камяністыя, тэхніка часта псуецца. А без яе, вядома, як без рук...

Яшчэ пра некаторыя «але» расказаў Сяргей Анатольевіч Залаты, інжынер галіновай лабараторыі кафедры агульнай фізікі, старшы на сельгасработах.

— Вельмі высокія нормы — 520 кілаграмаў бульбы за дзень, а фактычна мы выбіраем 300—350 — і то ў лепшым выпадку. Можна было б працаваць эфектыўней. Мяркуйце самі, зараз на радку стаіць па шэсць чалавек, калі хапіла б і чатырох, здаецца, вывад просты: хай і стаяць па чатыры, але куды падзець лішніх, людзі працуюць па брыгадах, ды і памеры палёў абмежаваныя. Не хапае арганізацыйнай гібкасці. А працуем мы сапраўды нядрэнна: за 10 дзён — 215 тон бульбы. Да 1 кастрычніка саўгас плануе закончыць уборку.

Хацелася паразмаўляць і з сакратаром партыйнай арганізацыі саўгаса Міхаілам Міхайлавічам Лапоткам. Дарэчы, чула пра яго і ад мясцовых жыхароў, і ад гарадскіх: «Парторг — чалавек надзейны, справу ведае». Але высветлілася, што знайсці яго не так проста, у праўленні параілі: «Лавіце дзе-небудзь на дарогах».

Мне не шанцавала, раз-другі бачыла толькі пыл ад яго «Масквіча», а калі зусім ужо страціла надзею, — сустрэла, ён гутарыў ля сталовай з працаўнікамі. У размову пра шэфскія сувязі Міхаіл Міхайлавіч уключыўся ахвотна, адчувалася, што тэма гэтая яго турбуе.

— Добра, што шэфская дапамога універсітэта не абмяжоўваецца толькі ўборкай ураджаю. У нас склаліся прыемныя дзелавыя адносіны з намеснікам сакратара парткома БДУ Пятром Лаўрэнцевічам Салавым, ён уважліва прыслухоўваецца да нашых просьбаў, удзельнічае ў арганізацыі грамадскай, культурна-асветніцкай работы. Супрацоўнікі універсітэта чытаюць лекцыі сельскім працаўнікам, калектывы мастацкай самадзейнасці выступаюць з канцэртамі. Мы, са свайго боку, імкнёмся стварыць добрыя бытавыя ўмовы нашым памочнікам, не ўсё яшчэ атрымліваецца, але ёсць і станоўчыя зрухі: наступнай вясной будзе гатоў інтэрнат — гэта матэрыяльнае сведчанне таго, што сувязі паміж вёскай і горадам яшчэ больш замацоўваюцца, а шэфская дапамога з эпізоду стала непарушным правілам.

...Мы ад'язджалі дадому ўвечары. Маладзенькія клёны ўжо зжаўцелі і неяк недарэчна вылучаліся залатым сваім лісцем сярод пануючай зеляніны. Першую палову дарогі, як гэта і належыць, размова вялася пра тое, што пакінулі: «Гарадок», працу.

— Нешта і вяртацца дадому, да сям'і не вельмі хочацца, — жартуе нехта.

— Уся справа ў арганізацыі, трэба мабільней выкарыстоўваць усе магчымасці, — працягвае пачатую спрэчку другі.

А ў саўгас у той жа дзень прыехала новая група супрацоўнікаў універсітэта, працягваць працу.

Н. НАДЗЕЖДЗІНА,
наш. кар.

● РАЎНЕННЕ НА ПРАВАФЛАНГОВЫХ!

ГАРЭЦЬ КАСТРУ ДРУЖБЫ

НА ПАЧАТКУ знаёмства з атрадам пачула тыя словы:

— Я вельмі рады, што ўзначальваю гэты атрад. Тут выразна відаць, як нараджаецца сапраўдны калектыў, як знаходзіць увасабленне ў жыццё адзін з галоўных прынцыпаў нашага грамадства — дружба.

Л. Л. Смілавіцкаму, супрацоўніку кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў, было чаго радавацца: два тыдні як знаёмы дзяўчаты, а ўжо паспелі пасябраваць, ды так, што і ў працы і ў песні — усе разам.

А «ўзышоў» «Лянок» на філалагічным факультэце, на першым курсе рускага аддзялення. Доўга думалі дзяўчаты над тым, якую назву даць атраду. Розныя былі прапановы, ды ў рэшце-рэшт спыніліся на гэтай. Напэўна таму, гавораць, што працаваць у асноўным будзем на льняных палетках. Уздымаць, перабіраць, вязаць.

Ды толькі не назва вызначае атрад, больш таго, яна — самая звычайная. У саўгасе «Авангард» Круглянскага раёна працуюць беларусы і рускія, украінцы і грузіны, латышы і эстонцы. Працуюць дружна, старанна.

— Вось тут вынікі нашай працоўнай дзейнасці за кожны рабочы дзень, — Леанід Львовіч падвёў мяне да вялікага аркуша паперы, што вісіць пры ўваходзе ў сталоўку. — Увесь атрад разбіты на дзве брыгады па 30 чалавек кожная, брыгады ў сваю чаргу — на звенні. А ўзначальваюць брыгады Галіна Юсевіч і Манана Цыхелашвілі...

І, мабыць, убачыўшы на маім твары нешта накшталт здзіўлення, дадаў. — Так, так, Манана Цыхелашвілі, грузінка па нацыянальнасці.

Ужо ад дзяўчат я пачула, што Манана, як кажуць, фармальны і нефармальны лідэр у атрадзе. Поварам на кухні дапамагчы — калі ласка. Матэрыял у атрадную газету напісаць — ніколі не адмовіць. Не ведаю, дзе вучылася Манана падымаць лён, але тое, што працуе яна ўмела, спрытна — факт бясспрэчны. І галоўнае, што ўсе яе словы і справы ідуць не ад загада — а ад уласнага сэрца і сумлення. І калі стане яна ў пары з Галінай Юсевіч — няма роўных дзяўчатам у полі.

Тут, у «Авангардзе», я ўпершыню сустрэлася з цікавай арганізацыяй працы студэнтаў. Да кожнага байца атрада даведзены пастаянныя нормы выпрацоўкі, устаноўлены каэфіцыент працоўнага ўдзелу. Усё гэта дазваляе звенням працаваць па метаду брыгаднага падраду, дзе кожны адказвае за ўсіх, а ўсе за кожнага.

У суботу, калі над навакольлем апускаецца вячэрні змрок, загараецца за вёскай касцёр дружбы і плывуць панад зямлёй песні народаў нашай краіны, і сярод іх адна, любімая:

Что б не погас у нас костёр
Веток подбрось...

Г. ГРЭЛЬ,
наш кар.

СТУДЭНТ! СУПРАЦОЎНІК! ВЫКЛАДЧЫК! ТВАЯ ЎДАРНАЯ ПРАЦА НА ВЕРАСНЁЎСКІМ ПОЛІ–ВАЖКІ ЎКЛАД У ВЫКАНАННЕ ХАРЧОВАЙ ПРАГРАМЫ

КЛЕЦК

Што нам дом пабудаваць

ЗАПЫЛЕНЫ «пазік» тармазнуў і, паволі развярнуўшыся, спыніўся пасярэдзіне двара. Праз некалькі хвілін машына кранулася далей, а на дарозе засталіся ўсе яго пасажыры — 25 чалавек.

Доўга прыглядацца да навакольля не сталі, уладкаваліся і— за справу. Студэнцкі будаўнічы атрад «Дзяржынец» пачаў сваю працоўную біяграфію. Атрад гэты фарміраваўся яшчэ ў снежні. Усе цяжкасці падрыхтоўчага перыяду галоўным чынам ляглі на плечы камандзіра атрада Юрыя Бурвана. Трэба было ведаць, а часцей не ведаць, а прадбачыць усё, што магло спатрэбіцца там, на рабочым месцы. Не так гэта проста, асабліва, калі ўлічваць, што арганізоўваеш будатрад упершыню. Не бяздзейнічаў і камісар Мікалай Кулік. Задоўга да выезду байцоў на месца дыслакацыі ў атрадзе ўжо мелася неабходная літаратура, былі падрыхтаваны плакаты і стэнды.

Усё гэта — самыя звычайныя клопаты любога СБА. Але ў «Дзяржынца» ёсць свая асаблівасць. Справа ў тым, што ўвесь яго састаў склалі слухачы падрыхтоўчага аддзялення юрыдычнага факультэта.

Кіраўніцтва на будаўнічай пляцоўцы ўзяў на сябе майстар атрада Уладзімір Некрашэвіч. Гэта толькі так спяваецца ў адной з песен, быццам дом пабудаваць — нязначны клопат. На самой справе гэта не так проста. Перш за ўсё таму, што амаль усім будатрадаўцам прыйшлося авалодваць будаўнічымі спецыяльнасцямі непасрэдна на аб'екце. І вось праз тыдзень чарговая «маланка» атрада назвала першыя імёны самых працавітых і кемлівых: Аляксандра Зайцава, Івана Жлобы, Сяргея Спірчонка, Віктара Цыкалы, Уладзіміра Нікановіча.

Скончыўся жнівень, а разам з ім і трэці працоўны семестр. Над сценамі складоў для МТС узнімаецца шыферны дах, з аднаго боку якога хлопцы, як таго патрабуе мясцовы звычай, прымацавалі сасновую галінку — на шчасце.

В. ЧАРНЯЎСКІ,
баец СБА «Дзяржынец», студэнт журфака.

ЗАЎСЁДЫ, калі размаўляеш з незнаёмым чалавекам і асабліва, калі чалавек гэты — асоба афіцыйная, патрэбен некаторы час, каб пераадолець натуральны бар'ер уласнай сарамлівасці, няёмкасці. Адсюль — зразумелая стрыманасць першых размоў. З Галяй гэтага не было. Шчырасць, захопленасць для яе арганічны. Яна так жыве. У манеры трымаць сябе — ніякай позы, а яна магла б і з'явіцца, бо Галя Краўчанка — камісар камуністычнага СБА «Маладосць», які набыў у гэтым годзе пэўную папулярнасць: рабяты першымі ў рэспубліцы вырашылі працаваць у дзіцячым доме, а заробленыя грошы пералічыць у яго фонд.

...Чалавечае гора. Кажуць, час — найлепшы лекар, але гэтыя маленькія назаўжды застануцца з палыновым прысмакам пакінутасці, гэта — незабыўнае. Жах сіроцтва, у ім спляліся і дзіцячыя мары пра цацку, і зусім сур'ёзныя, не кожнаму даросламу зразумелыя, размовы пра суд, пазбаўленне бацькоўскіх правоў, ці хворую маці...

Калі на педагагічным патоку механіка-матэматычнага факультэта хтосьці падаў ідэю папрацаваць летам у дзіцячым доме, ні адзін з іх нават і не разумеў, за якую справу бяруцца, якія цяжкасці, не столькі фізічныя, колькі маральныя іх чакаюць. І ніякага вопыту. Але каб быць выхавацелем, можа, і не вопыт той галоўнае, чулае сэрца — вось што заўсёды дапаможа ў складанай педагагічнай сітуацыі.

Дзяўчатам палюбілася слова «інтуіцыя», толькі дзякуючы ёй не разгубіліся, калі ўпершыню сустрэліся з патрабавальнымі дзіцячымі вачыма. І пачаліся працоўныя будні. Але чаго-чаго, а будзённага ў іх было мала. Штодзённа — адкрыццё, пошук, штодзённа — экзамен на чалавечнасць. Аднолькавых, марудных дзён, ды што там дзён—гадзін—не было! Арыентавацца трэба імгненна, часу на разважанні няма, бо твой «будаўнічы матэрыял» — дзеці, яны не даруюць абыякавасці, адразу заўважаць слабасць і разгубленасць. З'явіліся ў мове дзяўчат педагагічныя тэрміны, а камсамольскія сходы сталі надзённымі, хвалюючымі, палемічнымі. Спрэчкі, цікавыя прапановы, яны не ўзнікаюць на пустым месцы, нельга іх запланаваць, не будзе полымя, калі няма іскры. «Маладосць» яшчэ раз пацвердзіла: каб пазбегнуць нуды, не пайсці па звычайнаму шляху лёгкаважных «галачак», трэба адно — зацікаўленасць у сваёй працы. А гэта не проста. Адна справа, калі дзяўчынка шчабеча: «Ах, як люблю дзетак, яны ж такія прыгожанькія, як лялечкі!» І зусім другая, калі «лялечцы» гэтай трэба і штонікі памыць, і гузікі да кашулі прышыць. Да гонару дзяўчат з «Маладосці» трэба сказаць — празаічнай работы не спалохаліся, нават сяму-таму і персанал дзіцячага дома № 2 навучылі. Напрыклад, калыханкі спяваць, сцэнкі з цацкамі разыгрываць. Скажаце, дробязі! Успомніце, іменна з іх складаецца трапяткі вобраз дзяцінства.

МІНСК

БУДЗЬЦЕ МАЁЙ МАМАЙ

Спецыфіка працы патрабавала ад кіраўнікоў атрада не толькі выдатных арганізацыйных здольнасцей. Пра Лену Ліпу — камандзіра «Маладосці» — гавораць перш за ўсё як пра чалавека адказнага, настойлівага і адначасова вельмі добрага. Напэўна, гэтая актыўная дабрыня і дапамагла ёй атрымаць у сябровак найвышэйшую адзнаку: справядлівая, шчырая на дапамогу. Інакш і нельга, працуеш з людзьмі — ветлівасць і тактычнасць павінны стаць тваім другім «я».

Ніякая дарога не абыходзіцца без каменняў. Знайшлося б на што паскардзіцца і дзяўчатам з «Маладосці»: праязнымі білетамі не забяспечылі, працаваць часам прыходзілася без адпачынку, але ці станеш успамінаць пра гэта, калі стаіць перад вачыма даверлівы позірк Андрэйкі Мацвеева — аматара бегаць па карнізах, які лічыўся «складаным», ці, ужываючы спецыяльныя тэрміны, «педагагічна запушчаным». Штатныя выхавацелі раілі: «Прывязвайце яго да сябе, каб ні на крок не адыходзіў, а то невядома што выкіне!» Дзяўчаты не сталі прывязваць, ён сам да іх прывязаўся. Гэта не было казачным пераўтварэннем «гадкага качаняці» ў чароўнага лебедзя, цяжкасці захаваліся. І каб усе іх пераадолець, спатрэбіцца не адзін год, але хлопчык зразумеў, што прыцягнуць да сябе ўвагу можна і без дапамогі небяспечных вылазак.

Як ва ўсякай справе, было парознаму: і радасна, і не вельмі, але вынікі яе — каштоўныя. «Зараз і да людзей ставішся па-іншаму,—прызнаюцца дзяўчаты,—як з дзецьмі сябе паводзіць, такі і чалавек». Строгі, але і надзейны крытэрый.

Пачын «Маладосці» — добры, ён заслугоўвае самай пільнай увагі. Я не збіраюся біць у званы, не зазірнуўшы ў святцы, і заклікаць абавязковым чынам ствараць падобныя атрады на кожным педагагічным патоку факультэтаў універсітэта. Не, тут патрэбна грунтоўна ўзважыць усе «за» і «супраць», разлічыць свае магчымасці, творча падысці да фарміравання атрада, бо поспех залежыць літаральна ад кожнага яго члена. Дарэчы, атрад «Маладосць» не стаў называцца педагагічным, ён так і застаўся студэнцкім будаўнічым, але назва гэтая набыла іншы, больш шырокі сэнс. Яны будавалі чалавечую асобу, а гэта матэрыял надта ж крохкі, непадуладны ніякаму ціску.

...Шарэе за вокнамі вечар. Дванаццаць маленькіх ложкаў, дванаццаць засынаючых чалавечкаў, і ціхі шэпт: «Цёця, будзьце маёй мамай». Якое яшчэ трэба прызнанне?

Н. КАЛІШЭВІЧ,
наш кар.

Працоўны семестр атрада

АДЫШЛО ў мінулае гарачае студэнцкае лета, але яно засталося — у памяці і ў добрых справах.

СБА «Волаты» — адзін з лепшых ва універсітэце. Сёлета атрадам асвоены 200 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, што значна вышэй дагаворных абавязацельстваў. Жылыя дамы, фундамент сярэдняй школы, гароднінасховішча, пажарныя вадаёмы, бальніца — вось аб'екты будаўнічага атрада на Хабараўскай зямлі. Аказана шэфская дапамога саўгасу «Чарняева» раёна імя Лазо, які ў мінулым годзе апынуўся ў цэнтры вялікай паводкі. Арганізаваны канцэрты, прачытаны лекцыі, адбыліся і цікавыя спартыўныя турніры... Усяго не пералічыш. Але добра памятаецца: зайшло сонца, пасля сараказрадуснай спёкі, пасля соцен укладзеных цаглін і дзесяткаў кубаметраў бетону пішуць хлопцы дамоў лісты, гучыць гітарны перазвон і песня — пра Беларусь, пра тое, як гэта добра — будаваць!

В. ШАЧАК,
баец атрада «Волаты».

НА ЗДЫМКАХ: заканчваецца чарговы працоўны дзень; байцы атрада ля помніка рускаму першапраходцу Ерафею Паўлавічу Хабараву; у гасцях у пагранічнікаў суседняй заставы. Фота аўтара.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

30 верасня 1982 г.
Зак. 1712. АТ 21483

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ